З 1998 года Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў адпаведнасці з загадамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь праводзяцца агляды-конкурсы. Конкурсы выявілі тэндэнцыю да ўсведамлення бібліятэкамі краіны значнасці экалагічнай асветы, неабходнасці сістэмнай работы ў гэтым кірунку.



# У прыроду – праз бібліятэкі

Сёння ў цэнтры ўвагі грамадства аказаліся праблемы глабальных экалагічных змен як вынік нерацыянальнага, бяздумнага прыродакарыстання. Ускладняецца абстаноўка ў месцах высокай канцэнтрацыі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Асабліва абвастрылася сітуацыя пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. У сувязі з гэтым узрастае запатрабаванасць у экалагічнай інфармацыі. Бібліятэкі рэагуюць на такога роду запытанне і імкнуцца максімальна задаволіць яго, выкарыстоўваючы ўвесь свой інфармацыйны патэнцыял. На базе многіх з іх вядзецца шматаспектная работа па інфармацыйным забеспячэнні экалагічнай праблематыкі. Пра гэта сведчаць агляды-конкурсы, якія праводзяцца з 1998 года Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

Па выніках агляду-конкурсу можна канстатаваць, што на заключны тур прайшлі бібліятэкі, дзейнасць якіх вылучалася змястоўнасцю, насычанасцю разнастайнымі формамі работы, а дасланыя матэрыялы — высокай культурай афармлення. Усяго на III тур трапіла 57 бібліятэк. Шэраг з іх ужо набылі статус экалагічных цэнтраў ці базавых бібліятэк па экалагічным выхаванні ў сваім рэгіёне. Так, дзіцячы філіял Мядзельскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы адзін з першых у Мінскай вобласці быў перайменаваны ў "экалагічны цэнтр" і аб'яднаў у сваёй дзейнасці функцыі бібліятэкі і інфармацыйнага цэнтра па ахове навакольнага асяроддзя. Усё часцей пры бібліятэках ствараюцца экалагічныя клубы і гурткі аматараў прыроды, школы экалагічнай культуры і здаровага ладу жыцця. Больш за пяць гадоў пры філіяле Мядзельскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы працуе клуб "Аціс", на базе якога праходзяць Дні інфармацыі, Тыдні экалагічнай кнігі, фестывалі, інтэлектуальныя экагульні, вернісажы мастакоў, экалагічныя падарожжы, конкурсы на лепшы малюнак экалагічнай тэматыкі, кніжныя выстаўкі.

У сваіх работах бібліятэкі прадэманстравалі цікавыя інавацыйныя падыходы да асветніцкай дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя: экамарафоны, завочны экатурызм, экалагічныя асарці, экалагічныя лато, выстаўкі-пытальнікі, выстаўкі-крыжаванкі. Сістэмны, шматаспектны характар экалагічнай асветы, адукацыі і выхавання маюць і праграмныя распрацоўкі. Бібліятэка, як полістычны інстытут, забяспечвае выкананне гэтых праграм і праектаў інфармацыйна-дакументнымі рэсурсамі, інавацыйнымі тэхналогіямі ў галіне выхаваўчай дзейнасці. Заслугоўваюць увагі такія праграмы, як "З верай у будучыню" (Гомельская цэнтральная гарадская бібліятэка), "Я жыву ў Сусвеце" (Магілёўская абласная бібліятэка), "За духоўнае адраджэнне" (Клімавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), "Экалогія. Бібліятэка. Чалавек" (Мінская цэнтральная раённая бібліятэка), "Бібліятэка — цэнтр экалагічнай інфармацыі чытачоў рэгіёна" (Дзіцячая бібліятэка № 6 г. Мінска), "Жывая планета" (Пяршайская сельская бібліятэка Валожынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы).

Можна адзначыць прымяненне ў бібліятэках новых тэхналогій, выкарыстанне іх у мэтах збору, апрацоўкі і захоўвання інфармацыі, стварэнне баз даных па экалагічнай тэматыцы, выкарыстанне Інтэрнета, стварэнне CD-ROMаў. Укараненне камп'ютэрных тэхналогій дазваляе па-новаму раскрыць фонды бібліятэк і пашырыць іх магчымасці ў абслугоўванні карыстальнікаў. Пра гэта сведчыць вопыт Магілёўскай абласной бібліятэкі, якая стварае электронную базу сцэнарыяў экалагічнай тэматыкі, і Магілёўскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі, якая вядзе электронную базу даных прыродазнаўчага характару "Расцвітай, Магілёў, харство Прыдняпроўскага краю".

Неабходна заўважыць, што экалагічны агляд-конкурс набывае папулярнасць не толькі сярод бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры, але і сярод бібліятэк установ адукацыі. Узрасла колькасць школьных бібліятэк, бібліятэк сярэдніх навучальных установ, якія прынялі ўдзел у конкурсе. Высокім узроўнем вылучаецца работа бібліятэкі Кобрынскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа будаўнікоў і Вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячага сада-школы № 24 г. Барысава, якія падзялілі першае месца ў намінацыі "Лепшая бібліятэка навучальнай установы". Сістэмны і шматаспектны характар дзейнасці гэтых бібліятэк забяспечваюць распрацаваныя канцэпцыі экалагічнага выхавання, комплексныя праграмы экалагічнай адукацыі, бібліятэчныя праекты. Заслугоўвае ўвагі праграма школьнага экалагічнага цэнтра "Экалогія — XXI век", па якой працуе дзіцячы сад-школа № 24 г. Барысава. Вось яе асноўныя кірункі: супрацоўніцтва з шэрагам гарадскіх арганізацый і ўстаноў; аказанне метадычнай дапамогі педагогам у выбары форм і метадаў работы з навучэнцамі, падбор метадычнай літаратуры; правядзенне абласных, гарадскіх і раённых семінараў, мерапрыемстваў па экалагічнай адукацыі насельніцтва і школьнікаў. Адметная рыса ў дзейнасці бібліятэк, якія падзялілі першае месца, — разнастайнасць форм арганізацыі работы з чытачамі: лекторыі, вечарыны, літаратурна-музычныя кампазіцыі, інтэлектуальныя экагульні, віктарыны, конкурсы малюнкаў, экалагічныя падарожжы, экскурсіі на ўлонне прыроды, удзел у рабоце школьнага лясніцтва. Бібліятэкамі шырока

выкарыстоўваюцца сродкі масавай інфармацыі. Дзіцячы сад-школа № 24 г. Барысава штомесячна выдае часопіс "Папараць-кветка", дзе навучэнцы асвятляюць і свае праблемы, і горада, і ўсёй планеты.

Адметным з'яўляецца той факт, што на конкурс пачалі дасылаць работы бібліятэкі іншых устаноў, у прыватнасці, свой матэрыял прадставіла бібліятэка Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў. Актыўны ўдзел у конкурсе прынялі дзіцячыя бібліятэкі. Кожная другая з бібліятэк, якія прайшлі на III тур конкурсу, стала дыпламантам. Як паказалі матэрыялы, на першым плане дзейнасці дзіцячых бібліятэк — індывідуальная работа з кожным чытачом, задавальненне любых запатрабаванняў на інфармацыю па экалогіі. Плённа працуе ў гэтым кірунку дзіцячы філіял Бераставіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. З 1998 года бібліятэка пачала ажыццяўляць самастойна распрацаваную доўгатэрміновую праграму "Экалогія. Дзеці. Бібліятэка". На базе філіяла дзейнічае аматарскае аб'яднанне "Экалагічны буквар", з удзельнікамі якога праводзяцца не толькі цікавыя мерапрыемствы, гульнёвыя праграмы, але і экскурсіі на ўлонне прыроды. У бібліятэцы створаны спецыяльны фонд літаратуры па экалогіі, у які ўваходзяць энцыклапедыі, даведнікі, спецыяльная і папулярная літаратура, відэафільмы. Адна з задач, якую клапатліва вырашае бібліятэка, — афармленне інтэр'ера. Тут даводзіцца праяўляць шмат выдумкі і творчасці. Сёння Бераставіцкая дзіцячая бібліятэка ўяўляе сабой своеасаблівы зялёны "аазіс", дзе размешчаны прыгожы акварыум, зялёныя зоны з умела падабранымі пакаёвымі раслінамі, якія ствараюць камфорт і ўтульнасць. Эфектыўнасці работы з дзецьмі садзейнічае выкарыстанне бібліятэкарамі матэрыялаў краязнаўчага характару. Так, вялікую ўвагу работнікі бібліятэкі надаюць мастацкаму афармленню чытальнай залы, сцены якой упрыгожваюць палотны мясцовых мастакоў з краявідамі Бераставіччыны.

Жыццё пераконвае, што праца па экалагічнай асвеце насельніцтва павінна весціся бесперапынна, з дапамогай цэлага комплексу бібліятэчных сродкаў. Конкурсы на лепшую пастаноўку работы бібліятэк па экалагічнай асвеце і інфармаванні насельніцтва, мэтавыя доўгатэрміновыя экалагічныя праграмы і праекты, дзейнасць інфармацыйных цэнтраў і экалагічных клубаў, інавацыйныя формы абслугоўвання — гэта важкі пералік таго, што зроблена.

**Вольга КАКШЫНСКАЯ,**
вядучы бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.